16 ЛЮТАГА 2011 г. СЕРАДА № 6 (15657)
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# ГОРАД ЯК КРЫЖАВАНКА

**ПРЫКМЕТНАЯ постаць Антона, ці Марціна, з'яўляецца паўсюль, дзе ідзе гульня. Гарадская гульня. На маю просьбу расказаць, што гэта такое, суразмоўца тлумачыць: «Гарадская гульня — любая гульня, платформай для якой з'яўляецца горад. Нават калі мы гуляем у крыжыкі-нулікі, дзе кожны крыжык памерам з мікраараён». Да таго ж, хлопец называе любы горад «крыжаванкай». І ён гэтыя крыжаванкі разгадвае даволі паспяхова ўжо дзесяць год. Далей — пра тое, у што гуляюць сённяшнія дзеці горада, і дзе гульня пераходзіць у жыццё, а жыццё — у гульню.**



### Ведалі, як праверыць

*Зараз, захацеўшы, толькі ў Мінску можна знайсці з паўтара дзесятка гульнявых праектаў. У самым пачатку новага тысячагоддзя сітуацыя была іншай. Да беларускага хлопца Івана Маслюкова, стваральніка папулярнай зараз «Схваткі», толькі-толькі прыйшло разуменне: аднагодкі, якія прыпалі тварам да манітораў, маюць вострую патрэбу ў рэальнасці. Няхай сабе і паралельнай, гульнявой.*

— Быў вечар, — расказвае Марцін. — Я сядзеў на адным з беларускіх сайтаў і раптам пабачыў рэкламны банар: «Думаеш, шмат ведаеш? Думаеш, нічога не баішся? Думаеш, моцны духам? Мы ведаем, як гэта праверыць!». І я клікнуў мышкай: «Правярайце!». Адкрываю — а там восем заданняў-узроўняў. Сем ты праходзіш у інтэрнэце, а восьмы павінен быў выканаць у горадзе.

— Складаныя былі заданні?

— Не, калі параўноўваць з сённяшнімі, даволі простыя. Але і хуткасці ў беларускім інтэрнэце былі іншыя, і шляхоў пошуку неабходнай інфармацыі было значна менш. Менавіта ў той, першай, гульні я не ўдзельнічаў, таму што калі адкрыў заданні, ужо быў вядомы пераможца. А гэта была гульня, якая выходзіла ў горад. На Кастрычніцкай — вядомы «нулявы кіламетр». На ім пазначаны адлегласці паміж беларускімі гарадамі. Патрэбна было скласці некалькі гэтых адлегласцяў. Што тут пачалося! Удзельнікі бралі таксі і глыбока ўначы несліся на Кастрычніцкую, пазначалі ў нататніках лічбы, беглі да тэлефонаў-аўтаматаў (бо мабільнікі былі ў адзінак!), тэлефанавалі дадому, дыктавалі. Родныя, якія дзяжурылі каля камп'ютараў, «забівалі» адказ ў інтэрнэт. І ўсё гэта толькі каб прайсці ўзровень... Тады і аўтар гульні, Іван Маслюкоў, пабачыў: людзі гатовыя на дзеянні дзеля гульні ў рэальным жыцці. І ён вырашыў працягваць....

### Па гарызанталі — дарогі

*Гульні, якія выконваюцца на аўтамабілі, часам называюць гонкамі. Але гонкі гэта іншае. У праектах, «завязаных» на арыентаванне, на пошук кодаў і артэфактаў галоўнае значэнне ўсё-такі мае розум, лагічнае мысленне, у некаторых выпадках — фізічная сіла, а не лічбы на спідометры. Але дзякуючы аўтамабілю, цемры ды, часам, закінутым гарадскім будынкам, такія гульні мелі пах рызыкі.*

— Да таго ж, я атрымліваю асалоду нават у адчуванні таго, як гульня выглядае звонку. Прыпаркоўваецца аўтамабілі, з іх выбягаюць людзі з ліхтарыкамі, некаторыя нават у камуфляжы. Яны нешта шукаюць, перагаворваюцца па тэлефонах, часам — па рацыях. Для людзей звычайных мы — амаль суперагенты, — прызнаецца хлопец.

— Але, напэўна, і праблемы ўзнікаюць? З мясцовым насельніцтвам?

— Часцей гараджане дапамагаюць. Шматлікія ўжо ведаюць, што ідзе гульня. Сядзяць хлопцы, піва п'юць, а ты бяжыш. Яны: дай пяць тысяч рублёў, пакажам, дзе код, — смяецца Марцін. — Але здараецца рознае. Аднойчы ездзілі на гульню ў Гродна. Ёсць там вуліца Ветлівая, у прыватным сектары. Дык людзі спужаліся нашых машын ды выйшлі вялікім натоўпам «ратаваць» вуліцу! Нават заблакіравалі некалькі аўтамабіляў. І такая няветлівая сварка ўзнікла на Ветлівай! Жыхары вызвалі міліцыю, а мы — ДАІ. І менавіта ДАІ стала на наш бок: блакіраваць вуліцу ніхто, акрамя дзяржаўтаінспекцыі , не мае права. На тым і раз'ехаліся.

— Ці заўсёды праваахоўныя органы такія лаяльныя да ўдзельнікаў гульні?

— Часам мы з'яўляемся там, дзе быць не павінны. Напрыклад, на пагрузачнай станцыі чыгункі. Уваход туды вольны, але, калі там раптам з'яўляецца некалькі дзясяткаў людзей, якія невядома што шукаюць, некаторым гэта можа і не спадабацца... Аднойчы ў «Схватцы», быў узровень на чыгуначным вакзале, у мужчынскім і жаночым туалеце. Уявіце: калі натоўп людзей пачынае туды валіць, без асаблівага жадання заплаціць за ўваход, як тут не адрэагаваць міліцыі? Але, часцей за ўсё, удзельнікі гульні ды праваахоўнікі знаходзяць разуменне.



### Па вертыкалі — будынкі

*Сярод неаўтамабільных гарадскіх праектаў па арыентаванні самы буйны на Беларусі — «Адрыў». Праходзіць гульня пераважна днём, і дорыць удзельнікам, хутчэй, не экстрэмальныя, а экскурсійныя ўражанні. Перамяшчэнне — пешшу, на роварах, ды на гарадскім транспарце.*

— Гэта гульня мае своеасаблівы настрой, — працягвае Марцін, — падчас яе ў сваім горадзе адчуваеш сябе турыстам, у чужым — даследчыкам. Памятаю, праходзіў «Адрыў» у Віцебску. Патрэбна было знайсці вежу авіядыспетчарскага пункта былога ваеннага аэрадрома. Быў пазначаны нават мікраараён пошуку, але... Прыходжу туды: двароў шмат, хто ведае, куды ісці? Пачаў пытацца ў мясцовых. А ўсё маладыя жанчыны сустракаюцца, з калясачкамі — нядаўна тут жывуць. І вось ідзе пажылы мужчына. «Выбачайце. Не падкажаце, дзе тут знаходзілася ўзлётна-пасадачная паласа ваеннага аэрадрома»? І адказ: «Вы на ёй стаіце»! Гляджу — а я сапраўды стаю на паркоўцы з нейкім незвычайным пакрыццём. Гэты мужчына мне потым па дарозе расказаў усю гісторыю аэрадрома, а калі давёў да пункта, сярод шматпавярховак знайшлася... тая самая вежа! Такое было пазітыўнае адкрыццё!

— Наколькі «натрэніраванымі» павінны быць мазгі, каб паспяхова ўдзельнічаць? Як рыхтуешся?

— Амаль ніколі спецыяльна не рыхтаваўся. Толькі, калі сустракаю ў інтэрнэце ці газетах навіну пра змены ў горадзе, пра новыя помнікі, заўсёды ўважліва прачытваю. Бачу новую мемарыяльную дошку — заўсёды спыняюся, каб ведаць потым, каму ці чаму прысвячаецца. Бываюць заданні, паводле якіх патрэбна знайсці будынак незвычайнай формы. І ты сядзіш, гартаеш карту, старонку за старонкай. І вось калі выканаеш 20 такіх заданняў, на 21-м ужо нават і карта не спатрэбіцца.

— Кажуць, ты ўжо нават без карты выходзіш на маршрут?

— Здараецца, — усміхаецца хлопец. — Тыя, хто ўдзельнічае даўно, часам ускладняюць гульню для саміх сябе, каб нанава перажыць эмоцыі самых першых гульняў. Калі мы ўпершыню гулялі «ўцёмную», — быў такі драйв! — гаворыць Марцін. — Ёсць і другі спосаб ускладніць сабе задачу. Напрыклад, увечары ў пятніцу — дзве цікавыя гульні, адначасова. Ты доўга думаеш, куды ісці. У выніку — удзельнічаеш адразу ў абедзвюх. Уражанняў нельга перадаць!

### Адказы

**— Гульні змянілі цябе?**

— Так.

**— Дапамагаюць ці замінаюць гульні ў жыцці? Толькі шчыра.**

— Адназначна дапамагаюць. Экстрэмальныя — вучаць знаходзіць неардынарнае рашэнне неардынарных праблем, якія ставіць жыццё. Кароткі прыклад: было заданне зляпіць снегавіка, гульня праходзіла ў маі. Адразу здаецца: гэта ж немагчыма! А потым пачынаеш варушыць мазгамі і... Частка каманды выграбла снег з маразільнікаў. Частка — знайшла марожаніцу і доўгі час яе кроіла. А ўсе астатнія сцямілі: прыехалі да лядовых палацаў і папрасілі там снегу. І потым, у рэальным жыцці, ты разумееш: няма нічога немагчымага, у кожнай незвычайнай праблеме ёсць сваё вырашэнне. А вось гульні па арыентаванні дапамагаюць ведаць свой горад, не губляцца ў чужых. Дзякуючы такім гульням я надзвычай эфектыўна карыстаюся грамадскім транспартам у любым горадзе. Зноў жа — праз гульню з'яўляецца шмат сяброў. Людзей, з якімі аб'ядноўвае цікавасць да горада.

**Сняжана ІНАНЕЦ.**
**Фота з архіва героя.**

## САМЫЯ ВЯДОМЫЯ ГУЛЬНІ Ў МІНСКУ

**Пляцоўка Encounter Мінск** —экстрэмальныя пошукавыя гульні http://minsk.en.cx/;

Пляцоўка Encounter міжнародная, па Мінску яна аб'ядноўвае такія гульні, як «Схватка», «Кропкі» , «Кэшынг», «Фотапаляванне», «Відэапаляванне», «Фотаэкстрым», «Мокрыя войны», «Мазгавы штурм». Гульні — ад адкрыта экстрэмальных, з прыгодамі, у якія чалавек трапляе на пэўны час, да больш павольных, але надзвычай творчых і крышачку вар'яцкіх.

**Closed Racing Club** — аўтаклуб па гарадскім спартыўным арыентаванні http://crc.by/;

Нягледзячы на прысутнасць у назве слова «рэйсінг», ЦРЦ (так скарочана называюць гульню тыя, хто ў «тэме») як гоначнае сябе не пазіцыянуе. Замест кодаў удзельнікі шукаюць у горадзе канкрэтныя аўтамабілі, месцазнаходжанне якіх зашыфравана загадкай, рэбусам, фотаздымкам.

**MURS.by Racing Club** — аўтаклуб http://murs.by/;

У адрозненне ад ЦРЦ, ладзяць і гоначныя мерапрыемствы.

**«Сафары»** — гульня, арганізаваная пры мінскім аўтаклубе «Пежо» http://www.peugeot-club.by/site/

Створана, у асноўным, «для сваіх» — пераважна ўладальнікаў французскіх марак аўто.

**«Адрыў»** — гульня-даведнік, гульня-экскурсія http://www.otryv.by/;

Залікі: пешаходны, веласіпедны, транспартны (удзельнік перамяшчаецца на грамадскім транспарце). Кожная з «зашыфраваных» кропак — цікавае месца, маляўнічы закутак. Каб перамагчы, патрэбна разгадаць месцазнаходжанне ўсіх кропак, прапкласці па карце самы кароткі маршрут, а потым прайсці яго хутчэй за ўсіх.

**«Пошук»** — гэта гарадскі экшн з разгадваннем рэбусаў і загадак http://poszuk.info. Дарэчы, пешаходныя гульні апошнім часам сталі шырока ладзіць ва ўніверсітэтах і нават пры школах.

# КАМУ ВЫПЛАЧВАЦЬ СТЫПЕНДЫІ: усім ці толькі выдатнікам?

**НЯДАЎНА ў анлайн-інтэрв'ю, што праходзіла ў рэдакцыі «Газеты.RU», памочнік прэзідэнта Расіі па эканамічных пытаннях Аркадзь Дварковіч агучыў сваё бачанне стыпендыяльнага забеспячэння расійскага студэнцтва:**

«Калі мы лічым, што ўсяго трэба дабівацца сваёй працай, што трэба, каб стала модным працаваць, трэба адмяніць стандартныя стыпендыі ў студэнтаў, таму што гэта няправільны сігнал, што ты за сам факт сваёй вучобы атрымліваеш кампенсацыі. Можна працаваць пасля вучобы на кафедры, у бібліятэцы, у кавярні, пераклады рабіць... Калі ты таленавіты матэматык — можаш працаваць у свайго прафесара на кафедры, дапамагаць рабіць даследаванні і атрымліваць за гэта грошы. А калі гэта будучы менеджар — можна ў кампаніі нейкай працаваць па 2—3 гадзіны ў дзень. Я лічу, гэта больш правільна і больш танна для падаткаплацельшчыкаў, чым плаціць стандартныя стыпендыі».

Усерасійскі Фонд вывучэння грамадскай думкі вырашыў высветліць у радавых расіян, якой, на іх думку, павінна быць фінансавая падтрымка студэнтаў. Разважаючы над тым, як ва ўмовах абмежаваных фінансавых магчымасцяў дзяржавы будаваць палітыку фінансавай падтрымкі студэнтаў ВНУ, большасць расіян прапанавалі пакінуць усё так, як ёсць — гэта значыць, плаціць няхай і невялікую стыпендыю, але ўсім студэнтам (за гэта выказаліся 69 працэнтаў рэспандэнтаў). У меншасці аказаліся тыя, хто лічыць неабходным заахвочваць толькі асобныя катэгорыі навучэнцаў (16 працэнтаў апытаных). І толькі 5 працэнтаў удзельнікаў апытання выступілі за поўную адмову ад стыпендый, аргументуючы сваю пазіцыю тым, што студэнты і так навучаюцца за кошт дзяржаўных сродкаў. А 10 працэнтаў рэспандэнтаў увогуле не змаглі даць адказ на пастаўленае пытанне.

За тое, каб захаваць дзейны парадак выплаты стыпендый, выступаюць у роўнай ступені ўсе рэспандэнты, за выключэннем жыхароў Масквы і Санкт-Пецярбурга. Сталічныя жыхары часцей за іншых расіян схільныя падтрымліваць ідэю грашовага заахвочвання толькі асобных катэгорый навучэнцаў (за гэта выказаліся 28 працэнтаў жыхароў Масквы і Санкт-Пецярбурга). Гэтай жа пазіцыі схільныя прытрымлівацца і высокаадукаваныя расіяне (21 працэнт).

У выпадку, калі б быў прыняты варыянт выплаты стыпендый толькі асобным катэгорыям навучэнцаў, расіяне часцей за ўсё выступаюць за заахвочванне студэнтаў з малазабяспечаных сем'яў (64 працэнты) і тых, хто дэманструе выдатныя поспехі ў вучобе (61 працэнт). Актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ВНУ расіяне лічаць куды менш важнай падставай для выплаты стыпендыі (23 працэнты).

Варта адзначыць, што сярод тых, хто падтрымлівае варыянт выплаты стыпендыі асобным катэгорыям студэнтаў, большасць апытаных выступаюць менавіта за заахвочванне тых, хто добра навучаецца (82 працэнты). Рэспандэнты, якія прапануюць увогуле адмовіцца ад выплаты стыпендый, лічаць, што грашовых выплат заслугоўваюць толькі студэнты з малазабяспечаных сем'яў (70 працэнтаў).

Выплачваць стыпендыі, зыходзячы з матэрыяльнага становішча студэнтаў, прапануюць пераважна немаладыя рэспандэнты (68 працэнтаў). Арыентавацца на дасягненні ў вучобе лічаць неабходным расіяне ва ўзросце да 45 гадоў (64 працэнты) і высокаадукаваныя рэспандэнты (66 працэнтаў). Актыўны ўдзел у грамадскім жыцці важным крытэрыем лічаць рэспандэнты ва ўзросце да 35 гадоў (27 працэнтаў). Забяспечаныя расіяне больш схільныя выступаць за выплату стыпендый тым, хто добра навучаецца, і тым, хто ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Рэспандэнты з нізкай ацэнкай уласнага матэрыяльнага становішча, наадварот, часцей падтрымліваюць варыянт заахвочвання малазабяспечаных студэнтаў .

На сённяшні дзень стыпендыю ў Расіі атрымліваюць усе студэнты, якія навучаюцца без «троек» (па пяцібальнай сістэме). Аднак яе сярэдні памер складае ўсяго 1.100 расійскіх рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Клуб юнкараў

# РАЗВІТАЛЬНЫЯ ВЫДАТКІ

**ЯШЧЭ некалькі месяцаў — і кожная школа ў старонках сваёй гісторыі папоўніцца новым спісам выпускнікоў. Як развітаюцца хлопцы і дзяўчаты са сваімі навучальнымі ўстановамі і ў якія сумы гэта можа выліцца? Так, сучаснай моладзі ўжо мала проста фуршэта ў сценах школы, дыскатэкі і апошняй (а для вельмі вялікай колькасці школьнікаў і першай у жыцці) сустрэчы світання ўсім класам.**

Калі хто з выпускнікоў гэтага года яшчэ не вызначыўся са сцэнарамі свайго развітальнага вечара, дык можа пазычыць нашы ідэі. Так, мой клас усё ўжо абдумаў і вызначыў.

Усё гэта мы абмяркоўвалі на школьным сходзе разам з нашым класным кіраўніком і атрадам бацькоў. Ідэй было вельмі шмат, але мы прыйшлі да адзінага рашэння, і нават падумалі пра тое, як арганізаваць усё найбольш эканомна.

Першым артыкулам расходаў стаў школьны альбом. Мы запрасілі фатографа з сучаснай студыі, было дзве фотасесіі, адна (на якой рабіліся здымкі для партрэтаў) у студыі, другая — у нашай школе. Здымкі зарадзілі нас пазітывам, было весела ў іх удзельнічаць. Ужо да сярэдзіны зімы альбом будзе гатовы, і за яго кожны заплаціць каля ста тысяч рублёў .

Выпускны вечар павінен адбыцца ў сценах нашай школы, мы аднагалосна вырашылі запрасіць дыджэя, кожны паасобку павінен прынесці некалькі сваіх любімых песень. Дадайце да «выпускных выдаткаў» яшчэ па трыццаць тысяч з носа на дыджэя. А вось наконт фуршэту школьны сход вырашаў вельмі доўга: што ж лепей, кавярня ці школьная сталовая. Выбралі найбольш эканомны варыянт — на фуршэт у сталовай па папярэдніх разліках павінна пайсці па 15-20 тысяч з кожнага чалавека. У кавярні нам бы гэта каштавала не менш за трыццатку за кожную асобу. А на зэканомленыя грошы мы вырашылі схадзіць на апошні званок у парк забаў Dreamland, куды запрасілі і нашых дарагіх настаўнікаў. Салодкая цукровая вата, лета, атракцыёны — мы выдатна правядзём час, і хоць ненадоўга перастанем думаць пра будучыя выпрабаванні — наша галоўнае ЦТ.

Час на развітанне ў нас будзе не толькі на выпускным вечары з фуршэтам, начной школьнай дыскатэкай з ранішнім паходам на прыгожае возера, што знаходзіцца недалёка ад нашай школы. Пасля здачы цэнтралізаванага тэсціравання мы сустрэнемся яшчэ раз — вырашана зняць катэдж на прыродзе з саўнай, більярдам, басейнам і шашлыкамі. На ўсіх арэнда катэджа пацягне каля мільёна.

Развітальныя вечары можна разнастаіць рознымі дэталямі. Напрыклад, некаторыя выпускнікі замаўляюць лімузіны (паездка ў такой машыне ўключае шампанскае і ежу). Праўда, як расказалі мае знаёмыя, што «выпускаліся» летась, не ўсе іх аднакласнікі пагадзіліся на такія выдаткі, і таму лімузін замаўлялі толькі некаторыя з іх (за кожнага з аматараў раскошы бацькам давялося выкласці па сто долараў). Хтосьці замаўляе дарагія кавярні, нехта карыстаецца паслугамі крэатыўных агенцтваў... Якім быць вашаму выпускному, вырашаць толькі вам. Але вызначаючыся са сцэнарам, не забудзьцеся на галоўнае, што гэта час сабрацца ўсім разам, падзяліцца ўспамінамі, планамі.

**Аляксандра КАРАГІНА,**
**вучаніца школы №178 г. Мінска.**

# У ПАДАРУНАК ШКОЛЬНІКАМ — НОВЫ КАМП'ЮТАРНЫ КЛАС

**НОВЫ камп'ютарны клас адкрыўся ў Аршанскай сярэдняй школе № 13 пры тэхнічным садзейнічанні РУП «Белтэлекам». 13 новых камп'ютараў, устаноўленыя прадпрыемствам «Белтэлекам», адкрываюць сучасным школьнікам доступ да сусветных інфармацыйных рэсурсаў.**

Зараз доступ да інтэрнэта РУП «Белтэлекам» прадастаўляе практычна ва ўсіх школах па спецыяльна распрацаваных і арыентаваных на агульнаадукацыйныя ўстановы сацыяльных тарыфах. Для ўсіх навучальных устаноў дзейнічаюць тарыфныя планы высакахуткаснага доступу ў інтэрнэт « Школьны эканом» з абаненцкай платай 50 тысяч рублёў у месяц і «Школьны» (75 тысяч), што на 40—50 працэнтаў танней за аналагічныя тарыфныя планы для юрыдычных асоб. На пачатак бягучага навучальнага года хуткасць перадачы дадзеных па гэтых тарыфных планах ужо падвоілася пры захаванні ранейшага кошту.

— Садзейнічанне ўкараненню інфармацыйных тэхналогій для нас з'яўляецца адной з прыярытэтных задач, а дапамога ў камп'ютарным аснашчэнні школы — гэта сур'ёзны ўклад у будучыню, паколькі ў нашых дзяцей павінны быць самыя сучасныя ўмовы для атрымання адукацыі, — адзначыў на адкрыцці камп'ютарнага класа **генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Канстанцін ЦІКАР**. — Летась, дзякуючы сумеснаму праекту РУП «Белтэлекам», Міністэрства сувязі і інфарматызацыі і Міжнароднага саюза электрасувязі, у Беларусі адкрыліся 9 сельскіх цэнтраў грамадскага доступу ў інтэрнэт. У кожным цэнтры ўстаноўлены 4 рабочыя месцы з падключэннем да высакахуткасных інтэрнэт-каналаў, а таксама аснашчаныя прынтарам, сканерам і вэб-камерамі. Такія праекты, як школа і сельскія цэнтры — гэта яшчэ адзін крок у бок інфарматызацыі беларускага грамадства і больш глыбокага пранікнення інэрнэт-тэхналогій у жыццё людзей.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Я КІДАЎ КУРЫЦЬ...

Як нас дураць

**КАРЭСПАНДЭНТА «Звязды» прама ў карпункце надурылі, а ён зразумеў гэта толькі на наступны дзень. І прыйшлося заплаціць за тое, што ён і сам ведаў. Урэшце ўсё роўна я памру, і чаму за гэтую «нечаканую» інфармацыю трэба было яшчэ і плаціць?**

Як надурылі? Раскажу. Каб не паўтаралі памылак. Чытаў навіны на адным з парталаў у інтэрнэце. Зацікавіла прапанова прайсці бясплатнае тэсціраванне для курыльшчыкаў на сайце, якое ў свой час актыўна рэкламавалі на расійскіх каналах. Усяго патрабавалася адказаць на некалькі дзясяткаў пытанняў. Указаў спачатку, як і прасілі, рост, вагу, адзначыў, што куру кожны дзень з самай раніцы. Тэст ужо пачаў надакучваць. Пытанні наконт таго, ці ўжываю рыбу, якую ваду, ці курылі мае бацькі, ці часта адпачываю за горадам і гэтак далей.

Пасля таго, як тэсціраванне паспяхова завяршылася, трэба было са свайго мабільніка адправіць SMS (восем лічбаў) на кароткі нумар з чатырох лічбаў (нумар кароткі розны для жыхароў Расіі, Беларусі і гэтак далей — **А.П.**), каб атрымаць пароль для атрымання вынікаў тэсціравання.

Запытаеце: няўжо не зразумеў, што прыйдзецца плаціць? Паверыў у надпіс пра тое, што адпраўка паведамлення бясплатная. Дарэчы, пакуль чакаў код, з інтарэсам перачытваў тое, што напісалі на сайт тыя, хто, быццам бы, прайшоў ужо тэсціраванне. Першай размясцілі фота і кароткі тэкст мадэлі: «Каця Іванова, 23 гады, мадэль, стаж курэння 5 гадоў, Масква». Бландзінка Каця напісала, што дзякуючы гэтаму сайту пазбавілася ад дурной звычкі, якую «ў душы цярпець не магла».

Мог яшчэ выпрабаваць на сабе эфект «25 кадра», каб кінуць курыць, ды за гэта прыйшлося б заплаціць праз мабільны сто рублёў (відаць, расійскіх — **А.П.**), таму не рызыкнуў «вылечыцца».

Каб атрымаць вынік майго тэсціравання, прапанавалася, калі мне больш 18 гадоў, адправіць паведамленне з тэлефона. Вось гэтая ўмова пра 18 гадоў прымусіла задумацца, але ўжо было позна. У выніку я атрымаў пароль і яшчэ два паведамленні са словамі, што частка паведамлення адсутнічае. Пасля ўсяго гэтага ўвёў пароль, а потым прачытаў на маніторы, што, калі не кіну курыць, памру ў 58 гадоў, а, калі пазбаўлюся ад звычкі «жыць з цыгарэтамі» — у 73.

Самае нечаканае адбылося на наступны дзень. Паехаў у камандзіроўку ў глыбінку. Зайшоў у райвыканкам. Паколькі вельмі спяшаўся, паглядзеў на мабільны, каб убачыць, які час. Раптам бачу: SMS прыйшло. Думаў, нехта з сяброў нешта прыслаў. Высветлілася, што ад тэлефоннага апаратара: на маім мабільным рахунку мінус шэсць тысяч рублёў. А было ж больш за дзесяць тысяч. Вось і падлічыце, на якую суму мяне «кінулі». Тут я ўсё і зразумеў. Пабег на пошту аплаціць доўг.

Дарэчы на інтэрнэт-старонцы, сярод іншага, ёсць звесткі аб сярэдняй працягласці жыцця курыльшчыкаў: мужчын — 54, жанчын — 59. Дык навошта я і іншыя дурні плацілі? Не ўтойваюць інфармацыю аб тым, колькі сёння прайшлі тэсціраванне — больш за 950 чалавек, а пішу я гэтыя радкі раніцай (яшчэ і дзесяці гадзін няма — **А.П.**). Дык ці не лепш траціць грошы не на віртуальныя падманы, а пайсці да спецыяліста, які ўсё вам растлумачыць і прапануе лячэнне? Дарэчы, чаму курыльшчыкам дапамагаюць пазбавіцца ад звычкі курэння за грошы? І гэта, калі прызнана, што курэнне — такая ж залежнасць, як і алкагалізм, нават большая. Тысяч сто, а можа і больш для многіх — гэта вялікія грошы. Хоць, калі падлічыць, колькі траціць курыльшчык на цыгарэты...

Скардзіцца на тэсціраванне ў міліцыю? Памятаю сумны вопыт мінскага калегі, якому прапанавалі адправіць паведамленне з мабільніка, каб атрымаць выйгрыш. У выніку крымінальную справу не завялі.

Ды і стваральнікаў сайта (не указваю назву, каб і вас не дурылі — **А.П.**) знайсці не проста. Вучыцеся на маіх памылках. Можа хто з паважаных чытачоў падзеліцца сумным вопытам, як кідаюць у «сусветным павуцінні»? Чакаю лістоў і SMS-паведамленняў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Утерянную зачетную книжку** Института парламентаризма и предпринимательства № 22127-42 на имя Стаселович Юлии Владимировны **считать недействительной**.

# Маразы ўрокі не спыняць?

**ЦІ могуць моцныя маразы стаць прычынай спынення ў навучальных установах заняткаў? Гэтае пытанне сёння асабліва хвалюе жыхароў сельскай мясцовасці, чые дзеці вымушаны дабірацца ў школы за некалькі кіламетраў ад дома, няхай і на школьных аўтобусах.**

Як паведамілі журналісту «Звязды» ва ўпраўленні агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі, згодна з «Гігіенічнымі патрабаваннямі да ўладкавання, утрымання і арганізацыі навучальнага працэсу ў агульнаадукацыйных установах», пры неспрыяльных умовах надвор'я (ураган, тэмпература паветра мінус 25 градусаў і ніжэй, а таксама хуткасці ветру больш як 2 м/сек) **мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі можа прымацца рашэнне аб часовым спыненні адукацыйнага працэсу ў пачатковай школе, а таксама і ў старшых класах**. Яно і зразумела: аднаго «рэцэпту» для ўсіх быць не можа. Калі ў Віцебскай вобласці трашчаць маразы, то на Гомельшчыне ці Брэстчыне тэмпература пакуль не апускалася да крытычна нізкіх значэнняў.

Згодна з тымі ж гігіенічнымі нарматывамі, урокі фізкультуры на адкрытым паветры не праводзяцца пры тэмпературы паветра ніжэй мінус 15 градусаў і хуткасці ветру 1—3 м/сек. Ёсць і яшчэ адзін важны нарматыў, за якім павінна сачыць кіраўніцтва навучальнай установы: аптымальнай тэмпературай у вучэбных памяшканнях лічыцца тэмпература плюс 18 — плюс 20 градусаў, у спартыўнай зале — ад плюс 15 да плюс 18 градусаў і ў раздзявальнях пры спартыўнай зале — ад плюс 19 да плюс 23 градусаў. Калі бацькам падаецца, што ў вучэбным пакоі халаднавата, яны могуць паведаміць аб гэтым настаўніку, завучу ці дырэктару школы для прыняцця адпаведных мер і прывядзення тэмпературнага рэжыму ў норму.

Сёння ў Міністэрстве адукацыі створаны аргкамітэт, які адсочвае праблемы, з якімі могуць сутыкнуцца навучальныя ўстановы ў час моцных маразоў. Пакуль што трывожных сігналаў з месцаў не паступала.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

БПС-БАНК

**ОАО «БПС-Банк» проводит внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования путем письменного опроса акционеров 25 февраля 2011 года по адресу: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, офис центрального аппарата ОАО «БПС-Банк».**

**Повестка дня:**

1. Об оказании банком безвозмездной (спонсорской) помощи в 2011 году.

Внеочередное Общее собрание акционеров проводится по инициативе Правления банка (протокол заседания Правления № 6 от 10.02.2011).

Дата формирования реестра акционеров для составления списка лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров – 15 февраля 2011 года.

Бюллетени для заочного голосования вручаются акционерам (их представителям), имеющим право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, при их обращении в банк при предъявлении документа, удостоверяющего личность акционера (его представителя).

В голосовании участвуют бюллетени, полученные банком от акционеров (их представителей) не позднее 22 февраля 2011 года.

Акционеры банка могут получить информацию о включении их в список лиц, имеющих право на участие в заочном голосовании на внеочередном Общем собрании акционеров и другую информацию в соответствии с законодательством Республики Беларусь в центральном аппарате банка по адресу: г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6 или по телефону (017) 289 42 33.

**Председатель Правления** **Матюшевский В.С.**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Краіна здароўя
Выпуск № 8 (244)

# ПЕРШАЕ СЛОВА...

**Немаўля падрастае, і бацькі чакаюць, калі дзіця загаворыць. Але бывае, што мінае год, другі, а яно маўчыць. І тады даводзіцца паказваць малое доктару.**

Я не гаварыў доўга, і старэйшы сын пачаў размаўляць на трэцім годзе, і малодшы таксама не спяшаўся сказаць першае слова. І я прывыкшы да высновы, што калі дзіця доўга не гаворыць, то з яго ў будучым прамоўцы не атрымаецца. На сабе прыкмеціў: часам словы і думкі не зліваюцца ў адно цэлае.

Супакойвае той факт, што Майсей быў косназыкі і цяжка гаварыў, але менавіта яму Бог перадаў скрыжалі з запаветамі. Так што той, хто не ўмее добра гаварыць, няхай не перажывае. Ды і дзяцінства зменлівае.

Майму ўнуку не споўнілася і года, а ён ужо вымаўляў не асобныя словы, а будаваў з іх кароткія сказы. Калі ж яму мінула тры гады, то закралася думка, што расце талент — паэт, не інакш. Не ўтрымаўся і запісваў перлы, якія ўнук выдаваў у тым узросце.

Кожнае лета ўнук праводзіў у нас. Але якое было маё здзіўленне і расчараванне, калі на пятым годзе ўся тая непасрэднасць знікла. І мой унук стаў як усе дзеці.

А якое першае слова вымаўляюць малыя? На першым месцы стаіць мама, але не толькі. Баба, тата, дай, маё... — гучаць даволі часта. Праўда, дыяпазон тых слоў бывае яшчэ больш шырокі.

*— Аднойчы ў кабінет адна мама прывяла трайню хлопчыкаў. Малым па чатыры гады, а гаварыць не ўмеюць. Пытаюся ў першага, ці ведае ён хоць адно слова.*

*— ... тваю маць... тваю маць, — кажа малы.*

*А другі падтрымаў брата:*

*— Сука, сука.*

*Трэці, таксама, не адстаў:*

*— Бля... бля...*

*На траіх — тры словы, але сказалі іх чыста і выразна, —* пачуў я ад урача-лагапеда.



Каб разабрацца ў праблеме глыбей, падаўся ў гарадскую паліклініку №2, што ў Баранавічах і апынуўся ў кабінеце **ўрача Вольгі КРЫЦКАЙ.** Да яе і вядуць дзяцей, у якіх ёсць праблемы з мовай.

— Вольга Іванаўна, што вы можаце сказаць пра дзяцей, з якімі вам даводзіцца працаваць?

*— Найперш назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да моўнай паталогіі. І прычын, якія вядуць да парушэнняў мовы, шмат і яны разнастайныя. Чым яны выкліканы, можа вызначыць толькі спецыяліст. Іншым разам лагапеду неабходна кансультацыя неўрапатолага ці сурдолага, каб устанавіць прычыну.*

— Адно дзіця пачынае размаўляць рана, а другое — позна, як гэта адбіваецца на іх развіцці, будучыні?

*— Калі пачало гаварыць рана, то гэта добра. А вось калі пасля трох гадоў, то тут неабходна ўмяшанне спецыяліста. Магчыма, ёсць нейкая паталогія. Напрыклад, дзіця кепска чуе.*

— Значыць, прамоўцай можаш быць, хоць і позна пачаў у маленстве размаўляць?

*— Не мае значэння, дзіця возьме з часам сваё. Многае залежыць ад агульнага развіцця, становішча ў сям'і. Успомнім, што адзін знакаміты рымскі аратар быў напачатку косназыкім, але прыклаў намаганні і дасягнуў высокага аратарскага майстэрства.*

— Вы маю тэорыю не разбурылі, але прымушаеце яе перагледзець. Скажыце, як уплывае сям'я на развіццё мовы дзіцяці?

*— Пачнём з таго, што затрымка мовы можа быць звязана са стрэсам падчас цяжарнасці маці. Дзіця бывае рухавае, гіперактыўнае, але засяроджанае ў сабе. Яму прасцей маўчаць, чым гаварыць. Для малых вельмі важны кантакт з бацькамі. Паглядзіце, як усё прадумана ў прыродзе. Дзіця жывёліны, якія знаходзяцца на высокай ступені развіцця, вучыць сваіх дзяцей доўга. А як нашы бацькі часам робяць — уключаць тэлевізар, і на гэтым кантакт заканчваецца — абы малое маўчала. Вось яно і маўчыць. Вучыць дзіця размаўляць правільна і прыгожа неабходна з самага маленства.*

— У прынцыпе, так, але ці шмат у нас бацькоў, якія гаварылі б правільна?

*— Праблема існуе. Многае на сям'і завязана. Дзеці — люстраны адбітак бацькоў. Не трэба забываць і пра генетыку.*

— Атрымліваецца, што дзеці ідуць па слядах бацькоў?

*— «Шаблонных» дзяцей няма, усе яны неардынарныя. З маленства многія да камп'ютара прывыкаюць, але ж размаўляць трэба ўмець. Пра гэта ў нас і размова.*

— А як складваюцца вашы адносіны з бацькамі дзяцей? Вось прывядуць малое і, напэўна, лічаць, што цяпер доктар за ўсё адказвае.

*— Здараецца, што бацькі так і думаюць, але я стараюся не канфліктаваць. За лепшае прамаўчаць і ўсміхнуцца ў адказ. Па жыцці трэба настройвацца на пазітыў.*

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Будзьце пільнымі

# Прастуда перакінулася з дзяцей на дарослых?

**ПАВОДЛЕ інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, за апошні тыдзень (з 7 па 13 лютага) тэмпы росту захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў Беларусі знізіліся (тэмп росту склаў толькі 1,8 працэнта). Паказчык захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі перавысіў разліковы крытэрый эпідэмічнага ўзроўню ва ўсіх кантрольных гарадах і адпавядае сярэдняй ступені інтэнсіўнасці эпідэмічнага працэсу.**

Комплекс проціэпідэмічных мер уведзены ў Брэсцкай вобласці — у Баранавічах і ў арганізацыях аховы здароўя Пінска, Бярозаўскага, Івацэвіцкага, Камянецкага і Лунінецкага раёнаў; у Віцебскай вобласці — у Оршы, Віцебску, Наваполацку, Сенненскім Шумілінскім і Пастаўскім раёнах; на ўсіх адміністрацыйных тэрыторыях Гомельскай і Гродзенскай абласцей, а таксама ў Магілёве і Бабруйску. Дзеці складаюць у агульнай структуры захварэлых 52,7 працэнта, і іх доля сярод ахвяр прастуды пачала змяншацца. Затое сярод дарослага насельніцтва паказчык захваральнасці вырас за тыдзень на 16,7 працэнта. З мэтай раз'яднання дзяцей і папярэджвання далейшага распаўсюджвання інфекцыі па стане на 14 лютага вучэбны працэс быў спынены ў 201 школе. А ўвогуле з пачатку эпідэмічнага пад'ёму вучэбны працэс спыняўся ўжо ў 367 школах.

Па звестках Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у цэнтральнай, усходняй і паўднёва-ўсходняй частках еўрапейскага рэгіёна працягваецца расці колькасць зваротаў па медыцынскую дапамогу ў сувязі з захворваннем еўрапейцаў на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі. У заходняй частцы еўрапейскага кантыненту цыркуляцыя пандэмічнага штама грыпу A/H1N1 ужо пачала зніжацца, а на ўсходзе — ён, наадварот, актывізаваўся. У тых краінах, дзе распаўсюджанасць пандэмічнага грыпу зніжаецца, дамінуючую пазіцыю пачаў займаць грып B.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ёсць пытанне

# МРТ І КАМП'ЮТАРНАЯ ТАМАГРАФІЯ: «ПЛЮСЫ» І «МІНУСЫ»

***Патлумачце, калі ласка, чым камп'ютарная тамаграфія адрозніваецца ад магнітна-рэзананснай тамаграфіі? І ці можа адзін від дыягностыкі замяніць іншы?***

**С.В. ДЗІЧОЎСКАЯ**, *г. Мінск*

Магнітна-рэзанансная і камп'ютарная тамаграфія заснаваныя на розных тэхналагічных працэсах і прызначаныя для розных даследаванняў. У аснове камп'ютарнай тамаграфіі ляжыць выкарыстанне рэнтгенаўскага выпраменьвання, таму ёй уласцівы той жа недахоп — падчас даследавання пацыент падвяргаецца апраменьванню, хоць сучасныя апараты і дазваляюць знізіць дозу апраменьвання да мінімуму. Прынцып просты, як усё геніяльнае. Рэнтгенаўскія промні пранізваюць частку цела, што даследуецца, з розных напрамкаў, а разумны электронны мозг будуе выяву — зрэз цела. На экране манітора выразна бачна, ці ў парадку ўсе органы, ці не змяніліся іх памеры, ці не зрушыліся яны адзін адносна іншага, ці не з'явілася пухліна. У адрозненне ад невыразнай рэнтгенаўскай ці вельмі спецыфічнай ультрагукавой выяў камп'ютарны тамограф дае выразную карцінку. Яшчэ камп'ютарны тамограф можа перадаць дакладныя памеры ўсяго, што ёсць унутры нашага цела — з дакладнасцю да міліметра.

А ў тэхналогіі магнітна-рэзананснай тамаграфіі выкарыстоўваюцца магнітныя хвалі, а не рэнтгенаўскае выпраменьванне. Пацыента змяшчаюць у магнітнае поле, якое ўтварае МР-тамограф. За долю секунды апарат вылучае радыёчастотны імпульс, і малекулы тканак чалавека ўступаюць у рэзананс. Таму тамаграфію называюць не проста магнітнай, а магнітна-рэзананснай. Ядры атамаў адпраўляюць ваганні ў адказ, іх рэгіструе камп'ютар, ён жа праецыруе на экране выяву зрэзу тканак і органаў у розных плоскасцях. У выпадку неабходнасці можна атрымліваць трохмерныя выявы для больш дакладнай ацэнкі выяўленых змяненняў. Дарэчы, першапачаткова магнітна-рэзанансная тамаграфія называлася ядзерна-магнітнай — з-за ваганняў, якія ідуць ад ядраў атамаў чалавечых тканак. Аднак слова «ядзерны» пужала многіх, таму і было прынятае рашэнне перайменаваць метад, і цяпер ён называецца магнітна-рэзананснай тамаграфіяй. Ніякай ядзернай рэакцыі — і тым больш радыяцыі — у МР-тамографе няма. Гэта ўвогуле адзін з самых бяспечных відаў дыягностыкі, яго прызначаюць цяжарным жанчынам і маленькім дзецям.

А цяпер колькі слоў аб тым, на што здольны магнітна-рэзанасны тамограф і ці можа ён замяніць камп'ютарную тамаграфію ці ультрагукавое абследаванне. Магнітна-рэзанансная тамаграфія зараз з'яўляецца самым інфарматыўным метадам дыягностыкі марфалагічных змяненняў галаўнога і спіннога мозга. Спінна-мазгавым грыжам, пухлінам у пазваночным канале і поласці чэрапа ад магнітна-рэзанаснага тамографа «не схавацца». Затое МР-тамограф «не бачыць» дастаткова полыя органы і ў дыягностыцы захворванняў, звязаных з паражэннем лёгкіх, жоўцевага ці мачавога пузыра, інфарматыўнасць гэтага метаду абмежаваная. З дапамогай МРТ можна даследаваць суставы, печань, селязёнку, падстраўнікавую залозу, ныркі, матку з прыдаткамі. Даследаванне абсалютна бязбольнае: пацыент, лежачы на стале, не адчувае ніякіх нязручнасцяў, яму нават не трэба распранацца.

Навейшыя распрацоўкі ў гэтай галіне дазволілі адмовіцца ад апарата з гарызантальным магнітным полем (з гарызантальнай трубой), які абмяжоўвае магчымасці прымянення магнітна-рэзананснай тамаграфіі і выклікае дыскамфортныя адчуванні ў пацыентаў, якія пакутуюць ад клаўстрафобіі. Сучасныя МР-тамографы выкарыстоўваюць вертыкальнае магнітнае поле і з'яўляюцца магнітна-рэзанаснымі тамографамі адкрытага тыпу.

Камп'ютарную тамаграфію, у сваю чаргу, прымяняюць для дыягностыкі марфалагічных змяненняў розных унутраных органаў, выяўлення пухлін, унутраных крывацёкаў і гэтак далей. Надзейнасць гэтага метаду вагаецца ад 90 працэнтаў у выпадку паражэння падстраўнікавай залозы да 100 працэнтаў у выпадку дыягностыкі пухлін і расстройстваў мазгавога кровазвароту.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На заметку

# Якіх вітамінаў вам не хапае?



**Вясной асабліва востра адчуваецца недахоп вітамінаў у арганізме. Высветліць, якіх вітамінаў не хапае менавіта вам, дастаткова проста.**

- Выцягніце рукі далонямі ўверх і паспрабуйце сагнуць пальцы (акрамя вялікага) у двух апошніх суставах так, каб кончыкі пальцаў кранулiся далоні (суставаў паміж пальцамі і далонню не лічыцца).
- Калі не атрымаецца, то верагодны дэфіцыт вітаміну $B_6$.
- Непрыемны пах з рота можа сведчыць пра недахоп вітаміну $B_3$.
- Нават пры слабых ударах у вас з'яўляюцца і доўга не праходзяць сінякі? Хутчэй за ўсё, вы атрымліваеце мала вітаміну C.
- У тым, што вы пакутуеце ад галавакружэння і шуму ў вушах, можа быць вінаваты недахоп вітамінаў $B_3$ і E.
- Чырвань вачэй, доўгае прывыканне да цемры, ячмені часам звязаны з недахопам вітамінаў A і $B_2$.
- Выпадзенне валасоў бывае звязана з недахопам вітамінаў $B_9$, C, H.

Бяссонніцу можа выклікаць дэфіцыт вітамінаў групы B.

Аднавіць недахоп вітамінаў дапаможа **чырвоная рабіна.** У ёй шмат біялагічна актыўных рэчываў: вітамінаў, мікраэлементаў, арганічных кіслот і г.д., якія здольныя папярэджваць або лячыць тое ці іншае захворванне чалавека.

Рабіна, дзякуючы амігдаліну, які змяшчаецца ў ёй, таксама павышае ўстойлівасць арганізма да гіпаксіі (кіслароднага галадання). Больш за тое, нядаўна стала вядома, што амігдалін супрацьдзейнічае перакіснаму акісленню ліпідаў. Засцерагаюць унутрыклетачныя тлушчы ад акіслення таксама вітаміны C і E, якія ёсць у пладах рабіны. Дзеянне гэтых біялагічна актыўных рэчываў у пэўнай меры забяспечвае прафілактыку атэрасклерозу і паляпшае агульны стан арганізма.

Добра папіць нейкі час чай з ягад рабіны: 2 сталовыя лыжкі сухіх ягад заліце ў тэрмасе 0,5 літра крутога кіпеню. Настойвайце 1-2 гадзіны, а потым працадзіце. Прымайце па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень.

Як вітамінны, агульнаўмацоўваючы і прафілактычны сродак піце **чай з лісця чорных парэчак.**

2-3 сталовыя лыжкі сухіх здробненых лістоў чорных парэчак заліце ў фарфоравым чайніку 0,5 літра крутога кіпеню і настойвайце 10-15 мінут. Піце на працягу дня.

Пры авітамінозе і іншых захворваннях як лячэбны, прафілактычны і агульнаўмацавальны сродак прымайце **бярозавы сок.** Піце яго па адной шклянцы тры разы на дзень. Курс лячэння — 1 месяц. Пасля 1-2 тыднёвага перапынку ён можа быць паўтораны.

Бярозавы сок дапамагае таксама пры захворваннях лёгкіх (бранхітах, пнеўманіі, сухотах і г.д.), падагры, мочакаменнай хваробе, абменных артрытах, экзэме і іншых скурных захворваннях.

Пры гіпавітамінозах, якія суправаджаюцца знясіленнем, бледнасцю, сухасцю скуры, адсутнасцю апетыту, і ва ўсіх іншых выпадках, калі арганізм адчувае недахоп вітамінаў C і A, дапаможа **лісце першацвету.** Яно надзвычай багатае на вітаміны.

Як толькі з'явіцца гэтая першая веснавая зяляніна, выкарыстоўвайце яе для прыгатавання салатаў. Акрамя карысных уласцівасцяў, лісце першацвету мае пяшчотны і прыемны смак. Яно дапаможа вам спатоліць вітамінны голад, умацаваць і аздаравіць свой арганізм.

**Падрыхтавала**
**Вольга ШАЎКО.**

Інфарм-укол

## «Гэта інтэрнэт. Тут могуць паслаць...»

**Наколькі адпавядае сапраўднасці сцвярджэнне, што падлеткі, не падсаджаныя на інтэрнэт, абавязкова здаровыя, развітыя і ўладкаваныя?**

— Штораз, калі я сутыкаюся з гісторыямі пра дзяцей з як быццам уладкаваных сем'яў, якія трапілі ў дурныя кампаніі, пад дрэнны ўплыў, я задаю сабе пытанні: дзе тым часам былі бацькі і няўжо нельга было зацікавіць дзіця чым-небудзь больш прывабным, чым курэнне травы ў пад'ездзе? — каментуе **псіхолаг Мінскага моладзевага цэнтра «Поспех» Вераніка СТОГАВА.**

Адказ відавочны. Бацькі былі на працы, зараблялі фінансавы дабрабыт. А вось аб захапленні інтэрнэтам ведалі, што гэта ёсць зло, якое дрэнна ўплывае на здароўе новага пакалення. Дзіця ж павінна больш часу быць на свежым паветры. Вось яно, уласна кажучы, і было.

Вядома ж, усё, што занадта — не здарова. Ніхто не будзе сцвярджаць, што перад сядзеннем за камп'ютарам варта аддаць перавагу адпачынку з сям'ёй на прыродзе, заняткам у спартыўнай секцыі ці асваенню якога-небудзь віду мастацтва. Але асоба павінна развівацца гарманічна, і ў наш час інфармацыйных тэхналогій варта разумець, што анлайнавыя стасункі — гэта не заўсёды і неабавязкова знаёмства з парнаграфіяй. Калі дзіця нармальна кантактуе з равеснікамі ў школе, цікавіцца не толькі вучобай, то чаму б не распаўсюдзіць гэтыя стасункі яшчэ і на анлайн?

Адзін з контраргументаў часта заключаецца ў тым, што стасункі з камп'ютарам адбіваюць у юнага пакалення жаданне чытаць, а мудрасць усяго свету, як вядома, заключана менавіта ў кнігах. Шматразова праверана на практыцы: у сям'і, дзе чытаюць, дзіця так ці іначай пачне чытаць. Пакажыце яму прыклад, а не прымушайце праводзіць за кнігай патрэбныя гадзіны. А вось калі вы самі апошняй прачытанай кнігай лічыце падручнік, прагартаны дваццаць гадоў таму, не патрабуйце ад свайго чада трапяткой любові да класічнай літаратуры. Папулярнасць анлайнавых бібліятэк і форумаў, прысвечаных абмеркаванню літаратуры, гаворыць сама за сябе. І немалы працэнт наведвальнікаў гэтых рэсурсаў складаюць менавіта падлеткі.

Наступны камень у агарод аматараў сеткі — «павальная неадукаванасць на прасторах інтэрнэта». І зноў корань зла трэба шукаць у выхаванні і шырыні адукацыі асобы. Калі ваша дзіця чытае, думае, то застаецца адукаваным чалавекам і пасля таго, як пачынае кантактаваць у чаце ці блогу з адэптам контркультуры, які іначай як «па-албанцку» ўжо і ў рэальным жыцці не размаўляе.

Ненарматыўная лексіка? Ёсць грэх. Як было нейкі час напісана на адным папулярным рэсурсе: «Дзетка, гэта інтэрнэт. Тут могуць паслаць...». Расчарую ўсіх — на вуліцы таксама могуць, і паходы на прыроду ў кампаніі равеснікаў у сэнсе ўзбагачэння новымі васьміпавярховымі выразамі ніяк не саступаюць віртуальнаму паходу на udaff.com. Ды і школы сучасныя не падобныя на пансіёны для шляхетных дзяўчат. Часам нават настаўнікі дазваляюць сабе лірычныя адступленні ад нарматыўнай лексікі.

Ніхто не сцвярджае, што завісанне ў «сетцы» ўратуе дзіця ад негатыву рэальнага жыцця. Уласна кажучы, «сетка» — ужо частка нашага жыцця, адмахнуцца ад яе не атрымаецца. Проста трэба рыхтаваць дзіця да кантакту з ёю — гэтаксама, як вы рыхтуеце яго да кантакту ў школе. І тут, і там ёсць свае адмоўныя бакі, тое, чаго трэба пазбягаць, і тое, без чаго не абысціся.

Дарэчы, літаральна 150 гадоў таму чытанне кніг лічылася шкодным для здароўя, небяспечным для развіцця і нават здольным выклікаць запаленне галаўнога мозга. Не закідвайце на «авось» гэты бок жыцця дзіцяці. Калі вы дапаможаце яму знайсці сайты і рэсурсы, прысвечаныя яго інтарэсам, цікавыя форумы, бібліятэкі, фільматэкі — сядзенне за камп'ютарам будзе не толькі прыемным, але і карысным. А вы зможаце быць упэўнены, што ён не бадзяецца невядома дзе, пакуль вы на працы.

## «Дрэнным» людзям не хапіла матулінай пяшчоты

**Ранняя адсутнасць або недастатковасць кантакту з маці прыводзіць да грубай, часцей за ўсё незваротнай, паталогіі мозга.**

Паводле слоў **урача-сэксолага Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Дзмітрыя КАПУСЦІНА,** сучасныя метады даследавання мозга дазволілі выявіць, што ў дзяцей з-за адсутнасці кантакту з маці не развіваюцца ўчасткі мозга і лімбічнай сістэмы, адказныя за эмоцыі і здольнасць да прыхільнасцяў. Падчас стрэсу ў дзяцей ад 0 да 3 гадоў выпрацоўваецца стрэс-гармон, які проста расплаўляе пэўныя ўчасткі мозга. Адзначаецца, што дзеці, якія знаходзяцца да 1 года на грудным выкормліванні, эмацыянальна больш здаровыя, у іх вышэй інтэлект і памяць. Гэта тлумачыцца не толькі кантактам з маці падчас кармлення, але і атрыманнем разам з малаком маці гармону пралакцыну, які валодае антыстрэсавым дзеяннем.

Пры частых або працяглых разлуках з маці ў першы год жыцця ўжо ў дашкольным узросце ў такіх дзяцей выяўляецца павышаная агрэсіўнасць, жорсткасць, садысцкія схільнасці адначасова з няўпэўненасцю і баязлівасцю. Калі недастатковы фізічны і эмацыянальны кантакт з маці працягваецца да 3 гадоў, да вышэйпералічанага дадаецца неразборлівасць у выбары сяброў, адсутнасць прывязанасці да іх і сваякоў. Характэрны таксама ранні пачатак палавога жыцця (адначасова з палавым выспяваннем), неразборлівасць у выбары партнёраў, выпадковыя непрацяглыя сувязі без эмацыянальнай прывязанасці і закаханасці, нярэдка — падлеткавая прастытуцыя. Неразборлівасць у палавых сувязях можа даходзіць да поўнай абыякавасці да полу партнёраў, іх узросту (ад дзяцей да пажылых людзей), да кантактаў з блізкімі.

Да года жыцця любое, нават часовае, развітанне з маці ўспрымаецца дзіцем як трагедыя. Калі дзіця поўзае, робіць саве першыя крокі, то спяшаецца ў першую чаргу трапіць менавіта ў матуліны абдымкі. Для таго, каб смела крочыць па жыцці, неабходна быць цвёрда перакананым у тым, што ёсць чалавек, чыя любоў і падтрымка бязмежныя. Матуліна любоў — той фундамент, на якім расце любоў дзіцяці да ўсяго свету, уключаючы сваіх будучых дзяцей.

Паводле меркавання вядомага расійскага сэксапатолага Вячаслава Маслава, дзіця павінна засынаць, трымаючы за руку маці, якая расказвае яму рускія народныя казкі і спявае калыханку. У рускіх казках прысутнічаюць усе магчымыя сюжэты, якія раскрываюць шырыню і паўнату свету. Акрамя таго, у адрозненне ад замежных мульцікаў, яны вылучаюцца дабрынёй і шчаслівым фіналам.

Прыкладна да 1 года ў дзіцяці адбываецца працэс ідэнтыфікацыі сябе і ідэалізацыя маці. Некаторыя псіхолагі заяўляюць, што важнейшым узростам, які вызначае ўсё далейшае жыццё чалавека, трэба лічыць перыяд з 7 да 20 месяцаў жыцця. У гэты перыяд аўтарытэт маці надзвычай высокі. Абсалютная большасць спецыялістаў лічыць, што ў першыя 12 месяцаў іншыя блізкія вакол дзіцяці, у тым ліку бацька, не з'яўляюцца знакавымі фігурамі. Аднак роля бацькі рэзка ўзрастае да другога года жыцця, калі дзіця перакаалася ў абсалютнай любові маці. Дзіця пачынае праяўляць цікавасць да таго мужчыны, які жыве побач з маці. І ад таго, якія адносіны склаліся паміж бацькамі, ад выражанасці ў кожнага з іх мужчынскіх і жаночых якасцяў, ад даступнасці бацькі, правільных паводзін маці на шляху забеспячэння гэтай даступнасці залежыць, як завершыцца працэс палавой ідэнтыфікацыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Сёлета ў Беларусі плануецца трансплантацыя комплексу лёгкія—сэрца

**ЗАХВОРВАННІ сэрца і сасудаў — лідары ў спісе паталогій, якія пагражаюць здароўю чалавека, і менавіта яны — асноўныя прычыны смяротнасці і інваліднасці сярод дарослага насельніцтва. Да сардэчных катастроф могуць прыводзіць многія прычыны. Аднак сярод іх медыкі вылучаюць асноўныя фактары рызыкі: павышаны крывяны ціск і халестэрын, атлусценне, нізкую фізічную актыўнасць, няправільнае харчаванне, цукровы дыябет, курэнне.**

Выпраўляць тое, што нарабілі фактары рызыкі, даводзіцца кардыёлагам. У Беларусі справіцца з гэтым медыкам дапамагаюць новыя высокія тэхналогіі, якія зараз укаранёны айчыннымі спецыялістамі.

Загадчыца кафедры ўнутраных хвароб Беларускага медыцынскага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Наталля Міцькоўская гаворыць, што ўжо больш як дзесяць гадоў яна не накіроўвае сваіх цяжкіх пацыентаў на лячэнне за межы рэспублікі. У нашай дзяржаве, дзякуючы кіраўніцтву і супрацоўнікам РНПЦ «Кардыялогія», створаны структуры, здольныя выконваць неадкладныя ўмяшанні хворым на сардэчна-сасудзістыя паталогіі. Гэта такія ўмяшанні, як каранаангіяграфія, ангіяпластыка, кардыяхірургічнае ўмяшанне. Шанс у беларускага пацыента атрымаць дапамогу на самым высокім узроўні становіцца ўсё больш значным. Замежныя калегі ўжо ездзяць да нас не столькі каб прадэманстраваць нейкія новыя тэхналогіі, колькі для таго, каб абмяняцца вопытам. Калі за адным аперацыйным сталом стаяць нашы медыкі і іх калегі з іншых краін, навідавоку добрае прафесійнае супрацоўніцтва. Прычым не толькі на ўрачэбным узроўні, але і на сястрынскім.

**Вольга ШАЎКО.**

Во даюць!

## ПАЗБАВІЎСЯ АД ЛІШНЯГА ТЛУШЧУ? НЯСІ ЯГО Ў «БАНК»...

**Брытанская клініка ліпасакцыі прапанавала кліентам новую паслугу — кансервацыю выдаленага тлушчу для выкарыстання яго ў далейшым пры пластычных аперацыях.**

Перасадка тлушчавых тканак з адной часткі цела на іншую зараз шырока выкарыстоўваецца ў пластычнай хірургіі. Часцей за ўсё яна прымяняецца для «напаўнення» ўчасткаў скуры, якія «правіслі». Таксама тлушч з клубоў выкарыстоўваецца для павелічэння малочных залоз — у такім выпадку тлушч выконвае функцыю імплантанта.

Для кліентаў, якія праходзяць ліпасакцыю без неабходнасці перасадкі тлушчавых тканак, лонданская клініка The Private Clinic арганізавала «банк» тлушчу. У ім можна закансерваваць выдаленыя тлушчавыя тканкі метадам глыбокай замарозкі і захоўваць іх дзясяткі гадоў для выкарыстання ў старэчым узросце, калі некаторыя ўчасткі скуры стануць друзлымі і правіснуць.

Акрамя таго, можна асобна захоўваць выдзеленыя з тлушчавых тканак ствалавыя клеткі, каб дабаўляць іх да будучых тлушчавых трансплантантаў. Гэта паскорыць прарастанне ў іх сасудаў і паспрыяе больш хуткаму прыжыўленню тканкі. Па словах прадстаўнікоў клінікі, да іх ніхто падобную паслугу кліентам не прапаноўваў. Кошт кансервацыі складае 1200 фунтаў стэрлінгаў (каля 1950 долараў ЗША). Акрамя таго, за кожны год захоўвання свайго тлушчу кліенту прыйдзецца заплаціць 200 фунтаў стэрлінгаў, або больш як 320 долараў.

Як адзначыў медыцынскі дырэктар клінікі Майк Комінс, у тлушчавых тканках маладых утрымліваецца значна большая колькасць ствалавых клетак, якая з узростам змяншаецца. Таму ёсць сэнс зрабіць яе запас для будучай пластыкі. Такую працэдуру Комінс назваў «найбольш натуральнай формай касметычнай медыцыны».

## ПАДАТАК НА ШКОДНЫ ФАСТФУД

Улады адміністрацыйнага раёна Олдэм у графстве Вялікі Манчэстэр (Вялікабрытанія) прапанавалі ўвесці дадатковы падатак для кавярняў і закусачных, якія гандлююць фастфудам. Па ініцыятыве чыноўнікаў, установы грамадскага харчавання пры сваім адкрыцці павінны будуць выплаціць аднаразовы падатак у памеры тысячы фунтаў стэрлінгаў. Сабраныя такім чынам грошы будуць выдаткоўвацца на мерапрыемствы па барацьбе з дзіцячым атлусценнем. Распаўсюджанасць гэтага захворвання сярод дзяцей у Олдэме вышэйшая, чым у сярэднім па Вялікабрытаніі. Згодна са статыстыкай, усяго за дзесяць гадоў узровень атлусцення сярод дзяцей ва ўзросце да 9 гадоў павялічыўся больш чым у тры разы.

У муніцыпалітэце не выключаюць, што некаторыя з прадпрыемстваў змогуць пазбегнуць выплаты падатку ў тым выпадку, калі ім удасца даказаць свой намер прадаваць выключна карысную ежу.

Аўтары новай ініцыятывы сцвярджаюць, што ўжо ўтрымалі падтрымку прадстаўнікоў шэрагу суседніх муніцыпалітэтаў. У выпадку, калі іх прапанова будзе адобрана, а яго рэалізацыя будзе прызнана ўдачнай, аналагічныя падаткі могуць быць уведзены ў іншых рэгіёнах краіны. У 2004 годзе прапанова аб увядзенні аналагічнага падатку на фастфуд разглядалася ўрадам Вялікабрытаніі. Але на той час гэтая мера была абвергнутая ў сувязі з магчымымі негатыўнымі наступствамі для эканомікі краіны.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

## АМАТАРЫ ШТУЧНАГА СОНЦА РЫЗЫКУЮЦЬ ЗАХВАРЭЦЬ НА РАК СКУРЫ

**У 2010 годзе рак скуры выйшаў на першае месца ў структуры анкалагічных захворванняў у мінчан (89,3 выпадку на 100 тыс. чалавек). Гэта амаль на 17% больш, чым у 2009-м. Пра гэта паведаміў галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Гедрэвіч.**

У аматараў салярыя рызыка захварэць на рак скуры вышэй, чым у тых, каму не па душы штучны загар. Самы слабы кантынгент — жанчыны ва ўзросце да 29 гадоў.

Пры наведванні салярыя трэба выконваць меры засцярогі. У прыватнасці, звярнуць увагу на якасць абсталявання: работнікі салярыяў абавязаны своечасова замяняць лямпы. Акрамя таго, персанал павінен мець медыцынскую адукацыю.

Урачы не рэкамендуюць хадзіць у салярыі 16—17-гадовым дзяўчатам і юнакам, таму што ў будучым гэта можа прывесці да развіцця злаякасных новаўтварэнняў. Салярый супрацьпаказаны і людзям з шматлікімі радзімкамі, тым, хто дрэнна загарае і ў каго хтосьці з родных хварэў на рак скуры.

«Другі радок у спісе анкалагічных захворванняў займае рак лёгкага (34,5 выпадку на 100 тыс. чалавек). Рост у параўнанні з 2009 годам склаў 0,6%. У 90% выпадкаў хвароба справакавана курэннем», — працягнуў Зігмунд Гедрэвіч.

На трэцім месцы рак абадочнай кішкі (29,6 выпадку на 100 тыс. чалавек). Ва ўзнікненні гэтага віду раку асаблівую ролю адыгрывае канцэрагеннае ўздзеянне так званых другасных жоўцевых кіслот. Іх канцэнтрацыя павялічваецца пры ўжыванні бялкоў і тлушчаў жывёльнага паходжання. Відавочна, трэба калі не выключыць іх з рацыёну, то хоць бы зменшыць колькасць. Затое паказаны прадукты, багатыя на клятчатку і вітаміны A і C.

**Вольга ГРЫГОР'ЕВА,** *«Мінск—Навіны».*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. г. Ганцавічы.

## Створана вакцына супраць усіх відаў грыпу

**Вучоныя англійскага Інстытута Джэнера ў Оксфардзе стварылі ўніверсальную вакцыну супраць усіх відаў грыпу, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Спецыфіка віруса грыпу заключаецца ў яго формах, якія пастаянна мяняюцца. Гэта прыводзіць да таго, што вакцына проста не паспявае рэагаваць на хуткія мутацыі грыпу, а такім чынам, не здольная абараніць арганізм чалавека ад розных штамаў вірусу.

Распрацаваны спецыялістамі цуда-прэпарат выяўляе слабыя элементы віруса грыпу, а менавіта тыя яго часткі, якія застаюцца нязменнымі. Разам з тым вакцына актывізуе імунную сістэму чалавека і дае ёй магчымасць разбураць пратэін унутры віруса. Да гэтага моманту антыгрыпозныя лекавыя сродкі атакавалі толькі знешнюю абалонку віруса.

Універсальная вакцына прайшла ўсе клінічныя выпрабаванні і даказала сваю эфектыўнасць.

# ГАЗЕТЧЫКАМ ТРЭБА АСВОЙВАЦЬ ВІРТУАЛЬНУЮ ПРАСТОРУ

**Гэта ўжо не пажаданне, а патрабаванне часу, адзначыла на пасяджэнні калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Гомельскага аблвыканкама намеснік начальніка ўпраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Валянціна Мяшчэрская. Прыкладам плённай працы ў гэтым кірунку стаў сайт Рагачоўскай газеты «Свабоднае слова», якую адносна нядаўна ўзначаліў Андрэй Шышкін.**

Малады галоўны рэдактар за непрацяглы тэрмін змог сваю газету зрабіць папулярнай не толькі ў віртуале, але і ў рэальных лічбах. Прынамсі, тыраж вырас з 7654 да 9267 асобнікаў, а самаакупнасць за два гады ўзрасла са 100,1 да 113,2 працэнта. Сярэдняя зарплата павялічылася з 885 тысяч да 1 мільёна 31 тысячы рублёў. Як гаворыць Андрэй Генадзьевіч, у газеце далі «зялёную вуліцу» не толькі рэкламе, але і крытычным матэрыялам. Асабліва чытачы любяць штомесячную тэматычную старонку сатыры і гумару «Слова мае дзед Мяржа — праўду ён у вочы рэжа». Новы сайт з'явіўся ў «Свабоднага слова» ў жніўні 2010 года. Ранейшы сайт, распрацаваны для раённых газет Гомельшчыны, састарэў у сваіх магчымасцях падачы інфармацыі. У тым ліку не было зваротнай сувязі з чытачом. Новы сайт рэгулярна абнаўляецца і мае сучасныя формы падачы матэрыялу, што забяспечвае пастаянны рост колькасці наведвальнікаў. Так з'явілася і новая крыніца даходу — ад размяшчэння на сайце рэкламы.

На пасяджэнні калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Гомельскага аблвыканкама не толькі дзяліліся станоўчым вопытам работы, але і разважалі аб тых напрамках, дзе ёсць яшчэ нямала праблем.

— У нас не можа не выклікаць пытання высокі ўзровень змяняльнасці кадраў, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Гомельскага аблвыканкама Анатоль КАЦІЛА**. — Як паказала праверка Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2009 годзе, «лаўка запасных» у шэрагу раёнаў падабрана фармальна, а праца з імі вядзецца толькі на паперы. Ёсць і іншыя нявырашаныя пытанні. Так, да гэтага часу мае месца ўскладанне абавязкаў па арганізацыі ідэалагічнай работы на прадпрыемствах і ў установах на службовых асоб, не здольных, не падрыхтаваных да яе правядзення, а часта яны і не маюць элементарнага вопыту работы. Ключавым напрамкам нашай дзейнасці сёлета павінна стаць удасканаленне падбору, падрыхтоўкі і навучання кадраў. Ідэолаг на прадпрыемстве — той стрыжань, на якім маральны дух калектыву трымаецца. Невыпадкова, што яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя вядомы амерыканскі прадпрымальнік Генры Форд укладваў сур'ёзныя грошы менавіта ў сферу ідэалогіі, даваў сваім супрацоўнікам крэдыты на будаўніцтва жылля, і заахвочваў іх паездкамі на адпачынак. Былі і своеасаблівыя капіталістычныя дошкі гонару, і так далей. Хацелася б, каб узаемаадносіны ў калектыве, на прадпрыемстве былі такія, каб чалавеку хацелася ісці на працу.

Летась у вобласці была ўкаранёна новая форма працы з насельніцтвам — грамадскія прыёмныя, створаныя пры структурных падраздзяленнях РГА «Белая Русь». Асабліва станоўчы эфект ад новаўвядзення стаў відавочны напярэдадні і падчас правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Усяго на Гомельшчыне было створана 26 грамадскіх прыёмных, у тым ліку 5 — у абласным цэнтры. Па-ранейшаму важную ролю адыгрываюць інфармацыйна-прапагандысцкія групы. У мінулым годзе іх членамі была праведзена рэкордная колькасць сустрэч. У межах работы ІПГ грамадзян цікавілі пытанні, якія датычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, рамонту дарог, землекарыстання, транспартнага абслугоўвання, добраўпарадкавання населеных пунктаў, аздараўлення, сацыяльнай абароны і іншыя. У гэтым кірунку заслугоўвае ўвагі вопыт работы ідэолагаў Мазырскага райвыканкама. Пра яго падрабязна распавяла **начальнік аддзела ідэалагічнай работы Мазырскага райвыканкама Таццяна ГАНЧАРЭНКА**:

— Мы едзем у працоўныя калектывы, каб дапамагчы, а не «накапаць» нешта, каб зразумець болевыя кропкі. У нас кожны спецыяліст райвыканкама замацаваны за пэўным сельсаветам ці пэўнымі населенымі пунктамі. Мы ў краме задавалі самыя розныя пытанні людзям, каб разабрацца, што іх хвалюе на самай справе. Спрацоўвала адваротная сувязь — не проста пачуць, але і вырашыць праблемы, якія ёсць у людзей.

Тое, што большая частка рэгіянальных газет за апошнія гады змяніла ў лепшы бок не толькі свой знешні выгляд, але і змест, сведчаць усе. Відавочна павышэнне іх інфармацыйнай насычанасці, прафесійнага ўзроўню журналістаў, стварэнне ўласных інтэрнэт-рэсурсаў і, як вынік, пашырэнне аўдыторыі. З 2005 года па цяперашні час сярэдні разавы наклад мясцовых газет вырас са 124 да 184 тысяч асобнікаў, падпісны — са 117 да 168 тысяч. Але ж межаў для ўдасканалення няма, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення друкаваных СМІ і знешніх сувязяў Міністэрства інфармацыі Валянціна МЯШЧЭРСКАЯ**:

— Вялікая ўвага надаецца маладым кадрам, і гэта ўплывае на якасць газет. Сёння сур'ёзных канкурэнтаў на Гомельшчыне з боку недзяржаўных друкаваных СМІ ў дзяржаўных няма. Але гэта сёння. Таму супакойвацца нельга. Калі не будзе развіцця рэгіянальных СМІ, то заўтра такія канкурэнты могуць з'явіцца. Таму патрэбна штодзённая праца і барацьба за свайго чытача. Паколькі ёсць інтэрнэт-версіі, магчыма, за лік віртуальных наведвальнікаў павінна павялічвацца колькасць чытачоў. Сёння чатырохпалосны нумар рэгіянальнай газеты — анахранізм. У адукаваных людзей зусім іншыя, чым раней, патрабаванні да СМІ. Трэба абавязкова развіваць віртуальную прастору. Гэта задача не толькі для галоўных рэдактараў рэгіянальных выданняў, але і аддзелаў ідэалогіі на месцах.

У Гомельскай вобласці працуе сем студый мясцовага тэлебачання: у Гомелі, Мазырскім, Рэчыцкім, Светлагорскім і Жлобінскім раёнах. Але ж, нягледзячы на відавочную дынаміку развіцця рэгіянальнага тэлевяшчання, значнае павелічэнне праграм уласнай вытворчасці, Анатоль Каціла адзначае застой у пашырэнні зоны вяшчання мясцовага тэлебачання:

— Напрыклад, праграмы тэлеканала «Мазыр» маглі б цалкам быць даступнымі ў Ельскім, Калінкавіцкім, Нараўлянскім раёнах; Светлагорскага тэлеканала «Ранак» — у Акцябрскім і гэтак далей. Аднак для гэтага мала толькі ініцыятывы супрацоўнікаў электронных СМІ. У гэтым павінна быць зацікаўленасць выканкамаў, раёны якіх маглі б прымаць вяшчанне. Неабходна ўзмацніць развіццё і інтэрнэт-інфраструктуры рэгіянальных тэлерадыёкампаній. Ідэалагічнай вертыкалі неабходна не проста пасяваць за дынамічнымі зменамі свету і беларускага грамадства, але адэкватна і якасна рабіць усё магчымае для развіцця нашай краіны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПАДВЕЗЛА НА КАПОЦЕ
### Вадзіцель-жанчына «падвезла» пешахода... на капоце

Здарэнне адбылося ў вёсцы Занарач Мядзельскага раёна ў белы дзень. 40-гадовая жанчына, якая кіравала «Пежо-307», не справілася з кіраваннем на слізкім участку дарогі. Машыну вынесла на сустрэчную паласу. Там па краі праезнай часткі насустрач ішоў пенсіянер — мясцовы жыхар. Сутыкнення машыны з чалавекам пазбегнуць не ўдалося. У выніку 62-гадовы мужчына з цяжкімі траўмамі быў дастаўлены ў раённую бальніцу, дзе знаходзіцца і цяпер. Жыццю яго нічога не пагражае.

Па справе вядзецца разбіральніцтва. Хутчэй за ўсё, супраць жанчыны будзе заведзена крымінальная справа — яна дапусціла грубае правапарушэнне.

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

Дзмітрый ГОЛУХАЎ:

# «У КОЖНЫМ ВЫПАДКУ РАШЭННЕ АБ ІРО БЕЛАРУСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПАВІННА ПРЫМАЦЦА ІНДЫВІДУАЛЬНА»

**БЕЛАРУСКІ саміт рынкаў капіталу прайшоў на базе Міністэрства эканомікі, дзе прынялі ўдзел прадстаўнікі Deutsche Bank, Лонданскай Фондавай Біржы, Сбербанку, ААТ «БПС-Банк», а таксама беларускіх прадпрыемстваў. Мэтай гэтага мерапрыемства была актывізацыя дзейнасці айчынных прадпрыемстваў па прыцягненні інвестыцый на міжнародных рынках капіталу.**



— Тыя амбіцыйныя планы, якія ставяцца перад эканомікай Беларусі па значным павышэнні эфектыўнасці, па мадэрнізацыі вытворчасці, задаюць пэўныя патрабаванні да якасці нашай працы, да пошуку крыніц фінансавання. У сувязі з гэтым мы сумесна з нашымі калегамі на беларускім рынку і з калегамі на міжнародным рынку імкнёмся ствараць асяроддзе, якое дазволіць нашым прадпрыемствам насычацца ведамі і выходзіць на новы ўзровень разумення механізмаў функцыянавання міжнародных рынкаў капіталу, тэхналогій прыцягнення капіталу, — сказаў на брыфінгу пасля саміту **Дзмітрый ГОЛУХАЎ, намеснік міністра эканомікі**. — І ў гэтай сувязі я хачу адзначыць, што з узмацненнем жорсткасці фінансавай дысцыпліны ў бліжэйшы час, што з паглыбленнем разумення працэсаў фінансавання эканомік нам неабходна яшчэ шмат чаму навучыцца.

Аднак пакуль пэўных тэрмінаў і спісу беларускіх прадпрыемстваў, якія будуць выходзіць на міжнародныя рынкі капіталу, няма:

— Ініцыятыва павінна ісці не толькі зверху, але і знізу, ад прадпрыемстваў. Для іх створаны ўмовы, ёсць узаемныя інтарэсы міжнародных фінансавых інстытутаў, ёсць магчымасці, ёсць інфармацыя, — сказаў Дзмітрый Голухаў і дадаў, што працэдуры выхаду на ІРО (публічнае размяшчэнне акцый) патрабуюць шмат часу. — Выхад прадпрыемстваў на ІРО, як мне падаецца, павінен ажыццяўляцца ў рамках адзінай краінавай стратэгіі. Мы на саміце закранулі два пытанні — пазыковае фінансаванне і публічнае размяшчэнне. Збалансаваны адказ, як сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі, вядома, павінен улічваць асаблівасці бізнэсу, на якую міжнародную пляцоўку выходзіць, якія інструменты і працэдуры выкарыстоўваць, як узаемадзейнічаць з інвестарамі, а таксама ўлічваць сённяшні стан міжнародных і беларускага рынкаў. Усе гэтыя пытанні, як мне падаецца, на працягу бліжэйшых 1-2 гадоў будуць вырашацца дастаткова актыўна. Гатовых рашэнняў і гатовых адказаў няма, і, як мне падаецца, у кожным выпадку рашэнне павінна прымацца дастаткова індывідуальна, узважана, для дасягнення эфектыўнасці ў цэлым, з улікам сацыяльнага эфекту, з улікам тых мэт, якія мы, як краіна, ставім перад сабой пры выхадзе нашых прадпрыемстваў на публічнае размяшчэнне.

Дарэчы, ужо створана працоўная група па падрыхтоўцы да ІРО «БелАЗа», куды ў тым ліку ўваходзіць і Deutsche Bank.

— Мы разам з іншымі партнёрамі, якія былі запрошаны ўрадам у гэтую працоўную групу, у прыватнасці, з прадстаўнікамі нямецкай біржы, абмяркоўваем крокі, якія неабходна рабіць для падрыхтоўкі публічнага размяшчэння, — патлумачыў **Ёрг БОНГАРТЦ, старшыня праўлення Deutsche Bank**. — Гэты працэс займае шмат часу, як правіла, кампаніі могуць на працягу года прадпрымаць такія крокі, а можа, нават і болей. Мы зараз знаходзімся на першым этапе гэтага працэсу, яшчэ не вызначаны канкрэтныя наступныя крокі і, адпаведна, не зусім вядома, якія могуць быць цэнавыя параметры і моманты размяшчэння. Магу сказаць, што працоўная група ўжо актыўна займаецца гэтым пытаннем і мы паэтапна ідзём да наступных крокаў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ПРАДПРЫЕМСТВЫ МІНПРАМА АКТЫЎНА ІДУЦЬ НА НОВЫЯ РЫНКІ...

**ЛЕТАСЬ прадпрыемствы Міністэрства прамысловасці Беларусі павялічылі аб'ём вытворчасці прадукцыі на 17,4 працэнта ў параўнанні з 2009 годам да 25 трыльёнаў рублёў, паведаміў падчас відэабрыфінгу, арганізаванага Нацыянальным прэс-цэнтрам, намеснік міністра прамысловасці Віталь Прыма. У мінулым годзе экспарт вырас на 39 працэнтаў.**

Паводле звестак Віталя Прымы, аб'ём складскіх запасаў прадпрыемстваў і арганізацый міністэрства ўдалося скараціць з 3 трыльёнаў 196 мільярдаў рублёў на пачатак мінулага года да 1 трыльёна 450 мільярдаў на канец. Калі на пачатак 2010 года аб'ём складскіх запасаў складаў 142 працэнты да сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці, то да канца года гэты паказчык зменшыўся да 70 працэнтаў. «Гэтыя запасы, — заўважыў ён, — аптымальныя, каб своечасова выконваць вытворцамі патрабаванняў заказчыка». Гаворачы пра тое, якім чынам удалося дасягнуць такога істотнага зніжэння запасаў, Віталь Прыма, у прыватнасці, згадаў пра тое, што прадпрыемствы актыўна асвойвалі новыя рынкі збыту сваёй прадукцыі, развівалі ўласныя тавараправодныя сеткі, а таксама стваралі зборачныя вытворчасці за межамі рэспублікі. Так, ён адзначыў паспяховую работу зборачных СП у Кітаі, дзе, напрыклад, летась створанае пры ўдзеле «Гомсельмаша» прадпрыемства вырабіла 100 кормаўборачных камбайнаў, а на сёлета іх заказана ўжо 1 тысяча. Беларускія прадпрыемствы таксама паспяхова прасоўваюцца на рынак Казахстана, дзе прыступілі да стварэння СП па выпуску трактарнай і аўтатэхнікі, іншай прадукцыі, на рынак Азербайджана, шмат зборачных вытворчасцяў у Расіі. Нарошчваюцца пастаўкі тэхнікі ў Венесуэлу. Шэраг айчынных прадпрыемстваў удзельнічае ў расійскіх праграмах ільготнага банкаўскага крэдытавання для набыцця тэхнікі беларускай вытворчасці.

Віталь Прыма таксама праінфармаваў, што за мінулыя пяць гадоў прадпрыемствамі міністэрства было асвоена і выраблена на 776 мільёнаў долараў імпартазамяшчальнай прадукцыі. Па дзяржаўнай праграме імпартазамяшчэння і галіновых праграмах за пяцігодку рэалізавана 47 праектаў. Адным з іх стала арганізацыя вытворчасці зернеўборачных камбайнаў на прадпрыемстве «Гомсельмаш». Да 2007 года краіна імпартавала некаторыя віды гэтай тэхнікі, таму што айчынная вытворчасць не магла забяспечыць неабходныя ў ёй патрэбы. Цяпер жа створана поўная лінейка зернеўборачных камбайнаў высокай прадукцыйнасці, мадэльны рад гэтай тэхнікі пастаянна пашыраецца. Між іншым, больш за 50 працэнтаў гэтай прадукцыі экспартуецца. На думку намесніка міністра, эфектыўная работа прамысловага комплексу краіны павінна забяспечвацца за кошт павышэння эфектыўнасці вытворчасці, стварэння новых вытворчых магутнасцяў і нарошчвання экспарту.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# ДВУХБАКОВЫ РУХ

**«Спадзяёмся на дыялог» — зазначыў першы намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Аляксандр САДАЎНІЧЫ на пачатку сустрэчы з прадстаўнікамі малога бізнэсу па пытаннях рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы № 4.**

З малым бізнэсам нельга не лічыцца не толькі таму, што ў ім занята шмат нашых грамадзян, але і з пункту гледжання падаткаў: на Гродзеншчыне больш за 20 працэнтаў паступленняў у бюджэт забяспечваецца менавіта індывідуальнымі прадпрымальнікамі і прадпрыемствамі, дзе працуе да ста чалавек. Але, разам з тым, у гэтай сферы нямала «бар'ераў», рэзерваў, пра што адкрыта і зацікаўлена гаварылася на сустрэчы ў Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці. Адзначалася, у прыватнасці, што вельмі высокімі для малога бізнэсу застаюцца, асабліва для развіцця вытворчасці, стаўкі арэнднай платы, кошт праектных работ.

Нягледзячы на быццам і някепскае заканадаўства, слаба развіваецца фермерства, існуюць праблемы з выдзяленнем зямлі гэтым гаспадаркам. Маўляў, калі добра працуюць сельгаскааператывы, то навошта гэтыя фермеры? Хоць, з іншага боку, і такое пытанне: а колькі СВК аказаліся б стратнымі, не атрымліваючы вялізнай дзяржпадтрымкі?

— Трэба заняцца канкрэтнай працай па палажэннях Дырэктывы № 4. І пры гэтым адпаведным спецыялістам, юрыстам, эканамістам неабходна зрабіць аналітычны агляд заканадаўства (на сённяшні дзень — сотні розных актаў), якое рэгулюе прадпрымальніцкую дзейнасць, — лічыць **старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі прафсаюза «Садружнасць» Валянцін БРАНЦЭВІЧ**.

Камітэт дзяржкантролю, падкрэслівалася на сустрэчы, імкнецца да партнёрскіх адносін з прадстаўнікамі бізнэс-супольніцтва і гатовы, як кажуць, не толькі навучыць і папярэдзіць, але і падставіць сваё плячо ў канкрэтных праблемных сітуацыях. Як было, напрыклад, у выпадку парушэнняў пры спагнанні арэнднай платы на адным з рынкаў, дзе з прадпрымальнікаў незаконна ўзялі больш за 56 мільёнаў рублёў. Арэндныя стаўкі, паведаміў **начальнік упраўлення кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Андрэй ПАВЯДАЙКА**, змененыя, а вышэйзгаданую суму людзям вярнулі.

А вось іншая сітуацыя, таксама звязаная з грашовымі сродкамі. Летась Камітэт дзяржкантролю прааналізаваў, як суб'екты малога бізнэсу Гродзеншчыны плацяць заробкі. Аказалася, што ў 3160 з іх (транспартныя і цырульніцкія паслугі, рамонт аўтамабіляў, гандаль, будаўніцтва) сярэдняя зарплата была ў эквіваленце меншай за 200 долараў, у тым ліку нават ніжэй за «мінімалку» і бюджэт пражытковага мінімуму. У асобных — у межах ... 80-100 тысяч рублёў. Прычым такая нізкая зарплата не перашкаджала даволі значным расходам. З якой жа мэтай ствараліся такія прадпрыемствы?

Згодна з інфармацыяй **начальніка ўпраўлення кантролю органаў выканаўчай улады і каардынацыі дзейнасці кантрольных органаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Івана КАШКО**, вынікі гэтага аналізу былі абмеркаваны з шэрагам канкрэтных суб'ектаў гаспадарання. Потым пацікавіліся, якія высновы імі зроблены, і аказалася, што ва ўсіх — рэальныя змяненні. Што, аднак, пакуль не прымусіла выйсці «з ценю» многіх іншых. Хоць рух у кірунку дзелавога партнёрства паміж уладай і бізнэсам павінен быць двухбаковым...

**Камітэт эканомікі Гродзенскага аблвыканкама запрашае прадпрымальнікаў, усіх зацікаўленых асоб да абмеркавання праекта плана мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў Дырэктывы № 4 на сайце абласнога выканаўчага камітэта: www.region.grodno.by. Выказаныя меркаванні і прапановы будуць накіраваны ў Міністэрства эканомікі Беларусі.**

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


## ОАО «МИНСКГРУЗАВТОТРАНС»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 23 марта 2011 года ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества на 2011 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета Общества в отчетном периоде.
3. О результатах проверки аудитором и Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2010 год.
5. О распределении чистой прибыли и выплате дивидендов за 2010 год, утверждение направлений использования чистой прибыли на 2011 год.
6. Установление размера материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии, избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
8. Об утверждении новой редакции Устава Общества.

**Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, кор. 2 (2 этаж, к. 1). Начало собрания в 15.00.**

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, кор. 2, комн. 11) в рабочие дни в период с 12 по 22 марта 2011 года с 8.30 до 13.30, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 в день и по месту проведения собрания — по предъявлении документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров и доверенности.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 1 марта 2011 года.

**Справки по тел. (8 017) 22 624 27.**

УНП 100028545 *Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс»*


# ЦЯЖКІ ГРУЗ КАНФІСКАВАНЫ

**Позна ўвечары без суправаджальных дакументаў па аўтадарозе ў бок мяжы з Расійскай Федэрацыяй жыхар Гомеля вёз каля 33 тон лому чорнага і каляровага металу.**

Грузавы аўтамабіль «МАН» з прычэпам быў затрыманы ў Буда-Кашалёўскім раёне супрацоўнікамі міжраённага аддзела аператыўнага рэагавання і вышуку абласной ДАІ пры ўзаемадзеянні з памежнікамі і супрацоўнікамі АБЭЗ Савецкага аддзела ўнутраных спраў Гомеля. Перавозчык расказаў, што планаваў рэалізаваць лом у Расіі. Раней гамяльчанін прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічнае правапарушэнне.

Цяпер аўтамабіль і метал дастаўлены ў Гомель для правядзення праверкі, матэрыялы якой будуць перададзены ў гаспадарчы суд. У дзеяннях грамадзяніна бачыцца склад правапарушэння, прадугледжанага артыкулам аб парушэнні правілаў гандлю і аказання паслуг насельніцтву. Санкцыя гэтага артыкула прадугледжвае накладанне штрафу ў памеры ад 30 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй тавараў незалежна ад таго, у чыёй уласнасці яны знаходзяцца.

Толькі летась супрацоўнікі ДАІ Гомельшчыны затрымалі каля 580 тон лому чорнага і 62 тоны лому каляровага металу. Сёлета прайшлі 43 затрыманні па фактах нелегальнага абарачэння лому металаў, пры гэтым канфіскавана 303 тоны лому розных металаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**





## Наблюдательный совет ОАО «МЭФЗ» сообщает,

**что 23 марта 2011 года в 16.00 в актовом зале завода по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100, СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Минский экспериментально-фурнитурный завод».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
2. Об утверждении годового баланса, отчета о прибылях и убытках, отчета Ревизионной комиссии за 2010 год.
3. Об утверждении отчета об использовании чистой прибыли и начислении дивидендов за 2010 год и утверждении плана распределения прибыли на 2011 год.
4. Задачи ОАО «МЭФЗ» на 2011 год.
5. Об увеличении уставного фонда Общества в соответствии с Указом Президента РБ от 25.08.2006 г. № 528.
6. Об утверждении новой редакции Устава Общества и кандидатуры для его подписания.
7. О передаче в собственность Республике Беларусь объектов гражданской обороны.
8. Выборы нового состава Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

УНП 100219829

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 03 марта 2011 года ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

| Номер предмета торгов | № 1 | № 2 |
|---|---|---|
| Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота | Здание склада (здание хранилища (литер А 1/К), инвентарный номер 500/С-38265) общей площадью 1601,6 кв.м | Четырехэтажное блочное незавершенное законсервированное здание спального корпуса с холодной пристройкой общей площадью 1557,9 кв.м, инв. номер 600/U-75605 |
| Местонахождение имущества | г. Минск, пр-д Масюковщина, д. 2, корп. 2. | Минская обл., Минский р-н, район деревни Заречье-1 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 500000000006001528, площадь 1,5886 га | Кадастровый номер 623681700001000492, площадь 0,0973 га |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск | |
| Балансодержатель | ООО «НПКФ «Гиада», пер. Домашевский, д. 9, комн. 512 | ЗАО «Инвесткапстрой», ул. Свердлова, 2, г. Минск |
| Начальная цена | 1 577 524 410 белорусских рублей | 727 307 000 белорусских рублей |
| Сумма задатка | 100 000 000 белорусских рублей | 70 000 000 белорусских рублей |

На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **03 марта 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 17.02.2011 по 01.03.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок:**

**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

## КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор торгов УП «Гомельоблсоюзпечать») извещает о проведении *2 марта 2011 года* открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

| № п/п | Гос. номер | Наименование оборудования | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 5503 ЕАВ | **Легковой седан Фольксваген Венто – 1997 г.** двигатель – бензин, объем двигателя – 1,781 л, колесная формула – 2х4 | **3 245 000** | **300 000** |
| 2 | 8537 ЕА | **Газ-3307 грузовой фургон – 1999 г.** двигатель – бензин, объем двигателя – 4,25 л, колесная формула – 4х2 | **4 620 000** | **400 000** |
| 3 | 8538 ЕА | **ГАЗель-2705 – 1999 г. – грузопассажирский** темно-коричневый, двигатель – бензиновый, объем двигателя – 2,445 л | **2 970 000** | **200 000** |

**Продавец:** УП «Гомельоблсоюзпечать», контактный телефон: 74 51 45. **Имущество расположено по адресу:** ул. Ланге, 2а, г. Гомель, 246050.

**Шаг аукциона – 5 %.** К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения ***по 28 февраля 2011 г. включительно***. Подача документов по почте не допускается.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца р/с № 3012000740011 филиал ОАО «БПС-Банк» по Гомельской области, МФО 151501360, УНП 400010817, ОКПО 01195187.**

Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г. Подробная информация опубликована в газете «Звязда» от 4 декабря 2010 года № 238.

**Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 51 45, 74 17 34.**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Для всех форм собственности Для любых целей

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Дорожно-строительный трест № 2» 25 февраля 2011 г.**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Цель использования | Начальная цена продажи, бел. руб./ Минимальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка (в т.ч. НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Производственно-бытовой корпус | г. Ельск, ул. Ломоносова | Одно/двухэтажное кирпичное здание с коммуникациями общей площадью 1 022,2 кв.м | 644 092 649/ 200 000 000 | 64 409 265 |
| | Склад тарного хранения | | Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 1 377 кв.м | | |
| | Котельная | | Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 320,74 кв.м | | |
| | Здание трансформаторной подстанции | | Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 22,95 кв.м | | |
| | Здание склада навеса | | Металлическая сетка, общая площадь 136,08 | | |
| | Насосная над артезианской скважиной | | Одноэтажное кирпичное здание общей площадью 5,81 кв.м. | | |
| | Гараж | | Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 428,33 кв.м | | |
| | Проходная | | Двухэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 14,82 кв.м | | |
| | Технологическая емкость – 15 м³ – 2 шт., технологическая емкость – 90 м³ – 2 шт., технологическая емкость – 1 шт., емкость – 15 м³ – 2 шт., емкость 25 м³ – 2 шт.; емкость 400 м ³ – 4 шт.; 30 м³, 50 м³ , 60 м³ – по 1 шт. | | | | |
| | Весы автомобильные, внутриплощадочные электро- и тепловые сети, вагон – общежитие ВО-4 , битумохранилище, мазутохранилище, башня Родновского, артезианская скважина, площадка для изготовления бетона – 470 м². | | | | |
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 24 февраля 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а | | | | |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **25 февраля 2011 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» | | | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012029970016 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по г. Минску, код 334, УНП 102353509 | | | | |
| **Условие продажи** | Без условий | | | | |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность | | | | |

**Порядок проведения торгов:**

Начальная цена лота понижается с шагом в 10 **%** до момента, когда хотя бы один из участников аукциона согласится купить объект по объявленной аукционистом цене, но не ниже минимальной.

Если при понижении начальной цены подняли свои номера два и более участника, победителем признается участник первым поднявший свой номер. При невозможности определить победителя аукциона комиссия объявляет о снятии объекта с торгов.

**Дополнительная информация по тел.: 77 37 27, 77 52 87 (факс).**

